# АРХІЎ І ДАКУМЕНТ У КУЛЬТУРЫ, НАВУЦЫ, АДУКАЦЫІ І ДЗЯРЖАЎНЫМ КІРАВАННІ

## ГІСТПАРТ ЦБ КП(б)Б У 1921–1922 гг.

***Т. М. Агеенка***

*ДУ «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь»,
пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Беларусь, tata. agej@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца пытанні функцыянавання Гістпарта ЦБ КП(б)Б у 1921–1922 гг. Зварот да ўказанай тэмы абумоўлены шэрагам недакладнасцяў, выяўленых у працах, прысвечаных дзейнасці ўстановы. У першую чаргу – гэта адсутнасць дакладных звестак аб тым, хто ўзначальваў Гістпарт у вывучаемы перыяд. Другім важным момантам з'яўляецца пошук адказу на пытанне: ці праводзілася ўвогуле праца ў 1921–1922 гг.? Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі даюць адказы на пастаўленыя пытанні.

***Ключавыя словы:*** Гістпарт; ЦБ КП(б)Б; агітацыйна-прапагандысцкі аддзел; С. Кацэнбоген.

## HISRPART OF THE CENTRAL BUREAU OF THE COMMUNIST PARTY (BOLSHEVIKS) OF BELARUS IN 1921–1922

***T. M. Aheyenka***

*State Institution «National Archives of the Republic of Belarus», Nezavisimosti av., 116, 220114, Minsk, Belarus, tata. agej@gmail.com*

The article deals with the functioning of the Histpart of the Central Bureau of the CP(b) of Belarus in 1921–1922. Adressing this topic is due to a number of inaccuracies identified in the works devoted to the activities of the institution. First of all, this is the lack of accurate data on who headed the Histpart in the period under study. The second important point is the answer to the question: was the work carried out at all in 1921–1922? The documents of the National Archives of the Republic of Belarus and the Russian State Archives of Socio-Political History provide answers to the questions posed.

***Keywords:*** Histpart; of the Central Bureau of the CP(b) of Belarus; propaganda departament; S. Katzenbogen.

Гістпарт ЦБ – ЦК КП(б)Б з'яўляецца аб'ектам вывучэння даследчыкаў з пачатку 1980-х гг. Сярод тых, хто звяртаўся да гэтай тэмы, былі У. Міхнюк, Р. Платонаў, М. Шумейка. У сваіх працах аўтары падрабязна ахарактарызавалі пытанні дзейнасці камісіі. У той жа час сярод не да канца вывучаных застаецца пытанне аб тым, хто быў першым старшынёй Гістпарта. Некаторыя аўтары, адзначаючы, што сакратару ЦБ КП(б)Б В. Кнорыну даручалася «составить список лиц в эту комиссию», на аснове

гэтага рабілі выснову аб тым, што В. Кнорын і з’яўляўся першым старшынёй Гістпарта [1, с. 40; 2, с. 68; 3, с. 493]. Таксама аўтары так і не далі адказ на пытанне: ці праводзілася праца ў Гістпартце пасля яго зацвярджэння ў чэрвені 1921 г. да вылучэння калегіі ў лістападзе 1922 г. ? У большасці прац, пасля ўзгадкі пра стварэнне Гістпарта ў 1921 г., прыводзіліся адзін-два факты за 1922 г., у тым ліку зацвярджэнне ў лістападзе 1922 г. калегіі Гістпарта на чале з І. Вайнерам, пасля чаго аўтары пераходзілі да лістапада 1923 г., калі камісію ўзначаліў З. Жылуновіч. А ў некаторых працах адзначалася, што «выявить какие-либо результаты деятельности Истпарта в этот период [июнь 1921 – октябрь 1922 г.] не удалось; можно лишь предположить, что этой самой деятельности и не велось» [4, с. 115].

Стварэнню Гістпарта ЦБ КП(б)Б папярэднічаў ліст старшыні Гістпарта ЦК РКП(б) ад 1 ліпеня 1921 г., у якім указвалася на неабходнасць прадставіць звесткі аб дзейнасці камісіі [5, л. 3]. Пасля гэтага ЦБ КП(б)Б на пасяджэнні 10 чэрвеня 1921 г. зацвердзіла рашэнне аб арганізацыі Гістпарта. У пратаколе запісана: «т. Кнорину поручается составить список лиц в комиссию» [6, л. 74 адв. ]. Ні старшыня, ні склад Гістпарта не былі зацверджаны, мэты і задачы таксама не прапісаны.

У дакументах ЦБ КП(б)Б (у тым ліку пратаколах бюро і прэзідыума ЦБ, матэрыялах агітацыйна-прапагадысцкага аддзела), фондзе Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б (далей – Інстытута) звесткі аб дзейнасці камісіі за перыяд з чэрвеня па снежань 1921 г. не выяўлены. У штатных раскладах і спісах адказных супрацоўнікаў ЦБ, якія складаліся летам 1921 г., штатныя адзінкі для супрацоўнікаў Гістпарта адсутнічалі. Восенню 1921 г. у штатных раскладах ЦБ з’явіліся пасады загадчыка Гістпарта і вучонага сакратара, аднак яны былі вакантнымі [7, л. 17]. Такім чынам, можна выказаць меркаванне, што ў сувязі з вялікай перагружанасцю працай супрацоўнікаў ЦБ (што адзначалася ў шматлікіх дакументах ЦБ) Гістпарт быў зацверджаны фармальна, яго дзейнасць у 1921 г. так і не была распачата.

16 студзеня 1922 г. прэзідыум ЦБ разгледзеў пытанне аб Гістпарце і прызначыў навуковым супрацоўнікам, а таксама сакратаром Ахрамовіча (ён павінен быў сумяшчаць гэту працу з працай у партшколе) [8, л. 7]. Аднак звесткі аб яго дзейнасці не выяўлены.

На пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 18 красавіка 1922 г. быў зацверджаны план агітацыйнай працы, у якім, сярод іншага, указвалася на неабходнасць распачаць працу па падрыхтоўцы першай кнігі Гістпарта «Белоруссия

и КПБ», заняцца распрацоўкай дакументаў для зборніка «1905 год в Белоруссии» і матэрыялаў чысткі КП(б)Б, выяўленнем звестак аб нямецкім і польскім падполлі [14, л. 32]. Для рэалізацыі гэтых планаў неабходна было прызначыць адказнага за гэту працу. 20 красавіка 1922 г. на пасяджэнні калегіі агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦБ разгледжана пытанне аб Гістпарце. У рашэнні адзначалася: «а) составить бюро Истпарта согласно имеющихся указаний Истпарта ЦК РКП(б); б) Председателем бюро Истпарта ЦБ назначить тов. Каценбогена; в) Предложить тов. Каценбогену созвать в ближайшие дни первое заседание бюро Истпарта» [10, л. 3]. Разам з гэтым ён быў зацверджаны загадчыкам пададдзела друку агітацыйна-прапагандысцкага аддзела. У гэты ж час С. Кацэнбоген* з'яўляўся намеснікам рэктара БДУ, выступаў са шматлікімі лекцыямі.

У фондзе Інстытута захоўваецца ад рукі напісаны план працы (не падпісаны і не датаваны), складзены, верагодна, С. Кацэнбогенам і І. Фрыдляндам (на гэта ўказвае частковае супадзенне пазіцый, прадстаўленых у плане і цыркуляры, аб якім будзе ісці гаворка ніжэй). У дакуменце адзначалася неабходнасць арганізацыі апарата і калегіі Гістпарта; адабрання ўсіх гістарычных і архіўных матэрыялаў, што знаходзіліся на руках у асобных таварышаў, раённых і павятовых камітэтаў, савецкіх установаў і інш.; звароту да ўдзельнікаў рэвалюцыйных падзей, партыйных работнікаў з просьбай даслаць успаміны, артыкулы, аўтабіяграфічныя заметкі; распрацоўкі архіва; апрацоўкі, класіфікацыі, сістэматызацыі матэрыялаў па асобных перыядах гісторыі КП(б)Б; выпуску зборнікаў, прысвечаных пэўным перыядам гісторыі партыі, нямецкай і польскай акупацыям, Кастрычніку на Беларусі і Заходняй вобласці, пяцігоддзю КП(б)Б, гісторыі падполля; распрацоўцы архіваў жандармерыі [9, л. 65].

8 чэрвеня 1922 г. на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б было прынята рашэнне аб арганізацыі бюро Гістпарта Беларусі ў Маскве ў складзе В. Кнорына, М. Рафеса, В. Міцкявічуса-Капсукаса [8, л. 36]. Яно дзейнічала ў выглядзе Заходняй абласной камісіі Гістпарта і складалася з рэвалюцыйных актывістаў Заходняй вобласці і фронта, якія жылі ў Маскве. У далейшым камісія правяла шэраг вечароў успамінаў.

Правядзенне плана дзейнасці Гістпарта ў жыццё пачалося летам 1922 г. Так, на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 20 чэрвеня 1922 г. было разгледжана пытанне аб працы агітацыйна-прапагандысцкага аддзела, дзе адзначалася

---

* Адзначым, што ў анкеце Саламона Кацэнбогена за 1924 г., а таксама ў працах, прысвечаных яму, звесткі аб дзейнасці ў Гістпарце адсутнічаюць [11; 12; 13].

неабходнасць вылучэння пры павятовых камітэтах упаўнаважаных для распрацоўкі матэрыялаў па Гістпарту мясцовых арганізацый, выпрацоўкі інструкцыі для рэгіянальных бюро Гістпарта [14, л. 42 адв. ]. Пасля гэтага ва ўсе шэсць павятовых камітэтаў быў накіраваны цыркулярны ліст, у якім адзначалася: «…ценнейшие источники нашего прошлого не только не сохранены, но и уничтожены. Истпарт обращает в/внимание на огромнейшее значение для нас собирания материалов из прошлого. Ведь на нашем прошлом будут учиться будущие поколения и по нему будут судить. Каждый штрих, каждое воспоминание или слово, имеющее значение как исторический материал, должно не пропасть» [15, л. 50]. Акрамя вылучэння ўпаўнаважаных, павятовым камітэтам прапаноўвалася распачаць збіранне матэрыялаў, што знаходзіліся на руках ва ўдзельнікаў гістарычных падзей, арганізоўваць вечары ўспамінаў, пісаць успаміны, дасылаць артыкулы, біяграфіі, фотаздымкі і інш. і перадаваць сабранае ў Гістпарт, заняцца выяўленнем у мясцовых архівах каштоўных матэрыялаў і прывядзеннем ў парадак архіваў партыйных арганізацый.

На працягу лета 1922 г. інфармацыйныя лісты аб неабходнасці прадстаўлення ў Гістпарт матэрыялаў разаслалі асобным таварышам і арганізацыям, у тым ліку ў ЦК ЛКСМБ, Савет прафсаюзаў Беларусі, польбюро, Выканкам Мінскага савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, Дзяржвыдад, Дзяржпалітупраўленне [15, л. 1–11]. У чэрвені Гістпарт звярнуўся ў Цэнтрархіў БССР з просьбай пры апрацоўцы гістарычных матэрыялаў і дакументаў рэвалюцыйнага руху паведамляць у Гістпарт для зняцця копій ці атрымання арыгінальных дакументаў [9, л. 6].

У сярэдзіне 1922 г. з рэгіёнаў пачалі прыходзіць звесткі аб вылучэнні ўпаўнаважаных. Напрыклад, з Бабруйска паступіла выпіска з пратакола прэзідыума павятовага камітэта ад 10 чэрвеня 1922 г. аб прызначэнні Ноймана для сувязі з Гістпартам, адкрыцці пакоя-музея, арганізацыі свята пяцігоддзя Бабруйскай арганізацыі, адкрыцці помніка і інш. [9, л. 4].

20 чэрвеня 1922 г. за подпісам загадчыка агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦБ КП(б)Б Я. Быкіна, які ўзначаліў камісію пасля С. Кацэнбогена, у Гістпарт ЦК РКП(б) быў накіраваны наступны ліст: «…от Центр. Истпарта мы не получаем решительно никаких материалов, инструкций, бюллетеней, журнала “Пролетарская революция” и пр. изданий. Намереваясь установить постоянные сношения с Центр. Истпартом, убедительно просим прислать нам все вышедшие до сих пор издания» [5, л. 4]. У канцы жніўня 1922 г. ў маскоўскі Гістпарт накіравалі яшчэ адзін ліст,

які пацвярджае наша меркаванне аб фармальным існаванні ўстановы ў 1921 г. : «…высланные В/материалы еще 10 января нами не получены. Причина этому послужила то, что Истпарт в то время еще не был организован. В настоящее время Истпарт приступил и наладил уже в продолжение 2-х месяцев работу» [5, л. 7].

У канцы верасня 1922 г. загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦБ Я. Быкін быў адазваны ў распараджэнне ЦК РКП(б) [16, с. 295], пасля гэтага камісія прыпыніла працу. У новым складзе Гістпарт быў зацверджаны ЦБ КП(б)Б 27 лістапада 1922 г. Старшынёй прызначылі загадчыка агітацыйна-прапагандысцкім аддзелам ЦБ І. Вайнера. Дзейнасць і гэтай камісіі была не доўгай (па люты 1923 г. ), аднак праведзеная ёй праца знайшла сваё адлюстраванне ў пратаколах калегіі і артыкулах даследчыкаў.

Падсумоўваючы ўсё вышэй адзначанае, можна зрабіць выснову аб тым, што першым старшынёй Гістпарта ЦБ КП(б)Б па праву трэба лічыць С. Кацэнбогена. Дзейнасць камісіі была распачата толькі з красавіка 1922 г. і праводзілася пад кіраўніцтвам агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦБ, у структуру якога яна ўваходзіла. Шляхам рассылкі лістоў, стварэння маскоўскага аддзялення, вылучэння ўпаўнаважаных пры павятовых камітэтах ажыццяўлялася асноўная задача Гістпарта – збіранне матэрыялаў. Сярод прычын, якія тармазілі дзейнасць, трэба вылучыць перагружанасць супрацоўнікаў іншай працай, а таксама адсутнасць камунікацыі з Гістпартам ЦК РКП(б).

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг. ). Минск: Наука и техника, 1985.

2. Міхнюк У. М. Гістпарт Беларусі: асноўныя напрамкі дзейнасці // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. гум. навук. 1983. № 6. С. 68–71.

3. Платонаў Р. Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Т. 3. Мінск: БелЭН, 1996. С. 493–494.

4. Шумейко М. Роль белорусского Истпарта в собирании, сохранении и использовании архивов новейшей политической истории Беларуси // Архивы и делопроизводство. 2011. № 3. С. 114–119.

5. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 70. Воп. 2. Спр. 53.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 425.

7. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 440.

8. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 697.

9. НАРБ. Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 2.

10. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 936.

11. НАРБ. Ф. 15п. Воп. 1. Спр. 2055.

12. Память и слава: Соломон Захарович Каценбоген: к 130-летию со дня рождения / [редкол.: А. Г. Кохановский, О. А. Яновский, А. Н. Данилов; составитель А. Н. Максимчик]. Минск: БГУ, 2019.

13. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941) / науч. ред. О. А. Яновский. Минск: БГУ, 2017.

14. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 693

15. НАРБ. Ф. 60 п. Воп. 1. Спр. 3.

16. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / сост. Ю. П. Смирнов, Н. С. Сташкевич; под ред. Р. П. Платонова. Минск: Университетское, 1990.